# Зямля бацькоў – мая зямля

***А. А. Жукоўская,***
***настаўнік беларускай мовы і літаратуры***
***вышэйшай катэгорыі***
***Валеўскага дзіцячага сада – сярэдняй школы***
***Навагрудскага раёна***

На стварэнне гэтай п’есы-аднаактоўкі натхніла нас у першую чаргу актуальная сёння ідэя – выхаванне ў сучасных падлеткаў нацыянальнай самасвядомасці на аснове беларускага фальклору. Нам хацелася праз дзеі на школьнай сцэне нязмушана паказаць юным грамадзянам працэс пераемнасці і беражлівыя адносіны былых пакаленняў да сваёй нацыянальнай духоўнай спадчыны; зацікавіць гісторыяй і побытам жыцця дзяцей сярэдзіны 20 стагоддзя; пазнаёміць юных гледачоў з разнастайнымі жанрамі дзіцячага фальклору, якія звычайна застаюцца па-за межамі вучэбных праграмм, – з дражнілкамі, лічылкамі, прымхліцамі, гульнямі, танцамі, паданнямі, жартамі (анекдотамі), песнямі, а таксама з прызначэннем, відамі і сімволікай нацыянальнага ручніка, тапанімікай роднага паселішча. Кіравала намі яшчэ і аматарская прыхільнасць да тэатра, прыдаўся асабісты вопыт кіраўніцтва драматычным гуртком. Гэтай працай хацелася папоўніць пакуль што небагатую скарбніцу беларускамоўнай дзіцячай драматургіі.

Каб стварыць святочны настрой і падрыхтаваць гледачоў дзіцячых вячорак да актыўнага ўспрыняцця, варта добра прадумаць афармленне сцэны. Яе патрэбна ператварыць у беларускую сялянскую хату 50-60 гадоў 20 стагоддзя.

Спадзяёмся, што нашы дзіцячыя вячоркі “Зямля бацькоў – мая зямля” спадабаюцца юным артыстам, калегам-педагогам і ўвойдуць у рэпертуары школьных драматычных тэатраў ці студый.

Дзейныя асобы:
Бабуля Алена.
Кацярынка і Васілек, яе ўнукі.
Пяць дзяўчынак і два хлопчыкі, равеснікі Кацярынкі і Васілька .
Дзядзька Мікола, цётка Ганна і ўдзельнікі фальклорнай групы “Музыкі” - работнікі сельскага Дома культуры.

Сцэнар тэатралізаваных дзіцячых вячорак суправаджаецца мультымедыйным паказам.

*Вядучыя (хлопчык і дзяўчынка ў нацыянальных строях). Гучыць мелодыя песні “Мой родны кут” (сл. Я. Коласа, муз. І. Лучанка (цымбалы)).*

1. Зямля бацькоў – цудоўная зямля!
Пашчасціла і мне тут нарадзіцца.
Да скону дзён і зблізку, і здаля
Табою, любы край, мне ганарыцца!
2. Адна зямля ў нас з табой, адна,
Дае нам сілы чыстая крыніца –
Куды б мяне дарога ні вяла,
Табе хачу я нізка пакланіцца.

3. Мой край рамонкаў, сініх васількоў,
Тут плакаць і смяяцца можна ўволю.
Тут сустракаюць дарагіх сяброў
І песняй звонкаю, і хлебам-соллю!
4. Мы сёння ладзім свята,
Клічам госцейкаў у хату,
Той вячорак нашых варты,
Хто сябруе з песняй, з жартам.

**З'ява І**

*Ранняя вясна. На сцэне Кацярынка і яшчэ дзве яе сяброўкі.*

**Кацячынка**. Што такое Бацькаўшчына, знаеш?

**Алёна**. Гэта рэчка, сцежачка лясная,

**Насцечка.** Гэта ў лузе залатая пчолка,

**Алена.** А ў вачах тваіх – вясёлка.

**Насцечка.** Бацькаўшчына – гэта дом твой, школа.

**Алёна.** Гэта песні, што звіняць наўкола,

**Насцечка.** Гэта сама ты

**Алёна.** Гэта тата твой і мама.

**Насцечка.** І сябры твае таксама.

**Кацярынка.** Дзяўчаткі, хадзем са мной. Я вам нешта цікавае пакажу (*падыходзяць да куфра, Кацярынка адкрывае яго*).

У пахучым куфры важна ўсе ляжала,
Што сама бабуля працай рук прыдбала.
Быццам водар з поля прынясло да хаты –
Так запахла лугам, чабаром і мятай.

*Кацярынка дастае з куфра доўгі белы ручнік, які па канцах вышыты чорнымі і чырвонымі крыжыкамі. Дзяўчынкі дужа зацікаўлены ўзорам.*

**Насцечка.** Які прыгожы ручнік!

**Алёна.** Кацярынка, твая бабуля – рукадзельніца.

**Кацярынка.** Так, так.

*У глыбіні сцэны ціха з'яўляецца бабуля Алена. Яна падыходзіць да дзяцей і становіцца ля сярэдзіны ручніка.*

**Бабуля.** І чым гэта вы, мае дзеткі, тут заняты? І хто ж гэта вам дазволіў адкрываць мой куфар?

**Кацярынка.** Ой, выбачай, бабулечка! Я вырашыла паказаць сваім сяброўкам твой прыгожы вясельны куфар і ручнік.

**Бабуля** (*задаволена*). Ой, так, мае дзеткі! Гэта сапраўды мой вясельны ручнічок, падножнікам называецца. Калі я была яшчэ маладая (*цяжка ўздыхае*) і выходзіла замуж за вашага дзеда Васіля, то ў час вянчання ў царкве мы стаялі на гэтым белым даўгім ручніку. Перад Богам і людзьмі кляліся адно аднаму ў вернасці і каханні.

*У час аповеду бабулі з-за заслоны з'яўляецца Васілёк, які трымае на плячы ручнік-уціральнік і выцірае аб яго рукі.*

**Васілёк** (*падышоўшы*). Бабуля, а чаму ён такі доўгі і белы?

**Бабуля.** Доўгі і белы чаму? Відаць, таму ён доўгі, мае дзеткі, каб я з вашым дзедам шмат гадоў, аж да самае смерці, у пары жыла. А белы? (*задумалася*). Напэўна,

каб мы былі сумленнымі, давяралі адно аднаму, былі чыстымі ў думках і справах сваіх.

**Кацярынка**. Бабулечка, а што гэта за дзіўныя ўзоры на ім: і чырвоныя, і чорныя крыжыкі па канцах?

**Бабуля** (*задуменна*). Так, і сапраўды: цікавыя і загадкавыя вышыўкі на ім. Чорныя крыжыкі – гэта, відаць, наша зямля, глеба, куды кідаюць зерне ў час сяўбы! А чырвоныя – гэта, няйнакш, зярняткі і сонца, што даюць цяпло і жыццё ўсяму жывому. (*Праз вялікую паўзу*). А можа, мае дзеткі, гэта яшчэ і радасць, і сум. Не заўсёды ў людзей радасць бывае, прыходзіць і бяда. (*Рэзка пасля невялікай паўзы*). А што гэта апанавалі вы мяне ўсякімі – ўсялякімі пытаннямі? Давайце лепш, мае дарагія, песню заспяваем.

*Усе ўдзельнікі спяваюць беларускую народную песню “Купалінка”. За дзвярыма чуваць смех дзяўчынак і тупанне ног.*

## З’ява II

*У хату ўваходзяць тры дзяўчынкі.*

**Дзяўчынкі.** Добры вечар у хату!

**Бабуля і Кацярынка.** Добры вечар, дзяўчаткі! Заходзьце, калі ласка!

*Госці скідаюць верхняе адзенне і кладуць яго на лаву пры ўваходзе.*

**Наталька.** Прабачце, калі ласка, бабуля Алена, што парушылі ваш пакой, але мы прыйшлі да вас на вячоркі.

**Алеся.** Нядаўна нашы бацькі пайшлі да цёткі Агаткі. Ну, а мы, каб не сумаваць ды і вас павесяліць, таксама ціхенька падаліся за дзедам следам.

**Бабуля.** Сядайце, мае харошыя, уладкоўвайцеся! Толькі дужа не шуміце і не тузайцеся. А я пайду на кароўку зірну, ацяліцца вось-вось павінна.

*Выходзіць. Дзяўчынкі з невялікім штурханнем і шумам сядаюць на лаўкі. Невялікая нямая паўза.*

**Светка.** Ох, заўтра і вецер будзе!

**Васілёк.** А ты адкуль гэта ведаеш, такая разу-у-у-у-мна-а-я?! (*працяжна*)

**Светка.** Як жа ж адкуль? Ды прыкмета ёсць народная, калі вераб’і пералятаюць з месца на месца – чакай моцнага ветру. Ды й нашы гусі і куры пахавалі галовы ў пер’е і стаяць на адной назе – таксама на холад. А яшчэ я нядаўна чула ад майго дзядулі, што гэтая вясна наогул будзе сухая, бо мышы зрабілі гнёзды ў нашай саломе нізка (*паказвае*), пры самай зямлі. І яшчэ дзед казаў, што год гэты мокры будзе, бо вольха распусцілася раней бярозы. Вось як! (*Непрыязна, з выкрыкам зірнула на Васілька*)

**Васілёк.** Ну ты і вучоная, Светка-катлетка, доўгая шкарпэтка! (*Нахабна крывіцца пры дражнілцы*)

**Светка.** Што?! Зноў ты … (*Устае і ўзяўшы рукі ўбокі, ідзе ў наступ да Васілька*).

Васька-кабаська,
Куцы парасёнак:
Ножкі гнуцца,
Ручкі валакуцца,
Семдзясят парасят,
Толькі ножкі вісяць.

*Светка паказвае язык.*

**Васілёк.** А ты! А ты … (*Не ведае, што і сказаць*)

**Светка** (*не чакаючы, перабівае*) Васька! Курачка знеслася. Яечка ляжыць, а Васька не бяжыць.*Зноў крывіцца.*

**Васілёк** (*чуць не плача*). А ты! А ты …

**Кацярынка** (*прыпыняе і даволі сур'ёзна*). Годзе, блазнота! Сядайце па месцах. Зачалі сварку, як Юлька Каюкова. Лепш паслухайце, якую я вам гісторыю раскажу, што з нашай бабуляй Аленай некалі ў дзяцінстве адбылося. Хочаце ці не?

*Дзеці ўсе зацікаўлена згаджаюцца.*

Была наша бабулька яшчэ малой, як мы з вамі. Пайшла яна аднойчы на могілкі. А за ёю нейкі кот увязаўся. Вялікі, як сабака, чорны з белай шыйкай. Яна на яго замахнулася. А ён скрывіў галаву ды: "Мяў! Мяў! Мяў!" Тры разы мяўкнуў. Спалохалася мая бабулька, дастала крыжык і перахрысціла яго. І дзе ён толькі падзеўся.

*Спалохана ўсе загулі.*

А вось яшчэ паслухайце. Аднойчы прала наша бабуля кудзелю ў хаце з дзяўчатамі. Папрыходзілі да іх нейкія хлопцы. Прыгожыя. На вопратках гузікі блішчастыя. Селі каля дзяўчат і не даюць ім прасці. Усё завуць іх: "Пойдзем, дзеўкі, пойдзем на вуліцу". У нашай бабулі верацяно на падлогу звалілася. Яна нагнулася, каб падняць яго, аж бачыць у іх замест ног лапы. Паказала яна гэта дзеўкам. А хлопцы ўсё клічуць іх на вуліцу. А яны не ідуць. Тады хлопцы як свіснуць. (*Са страхам усе загаманілі*) Яблыкі ўсе пападалі, салома са стрэх павылазіла. Вось што было. (*Нечакана чуецца тупанне ног і звон перакінутых вёдзер. Усе дзяўчынкі з віскам і шумам хаваюцца: хто пад стол, хто пад лавы, а некаторыя туляцца да Кацярынкі. У хату ўваходзяць два хлопчыкі.)*

## З'ява III

**Хлопчыкі.** Добры вечар у хату!

**Васілёк.** Добры вечар, хлопцы!

*А ў дзяўчат ужо і дух заняло: ні жывыя ні мёртвыя.* Эй, вылазьце. Палахліўкі! (*Нагінаецца і глядзіць пад стол. Нагінаюцца і смяюцца хлопцы*). Гэта ж Андрэй-верабей з хлопцамі прыйшоў.

*Дзяўчынкі незадаволена вылазяць са сваіх схованак, асобныя з іх штурхаюць хлопцаў у спіны, плечы. Усе сядаюць на лавы.*

**Кацярынка.** А мы тут, хлопчыкі, розныя страхі расказваем. Праз тое і напалохаліся. Сэрца і цяпер яшчэ не супакоілася.

**Андрэй.** Што тут вашы страхі! А я з Юрасём нядаўна чуць не пабіўся.

**Дзяўчынкі.** І чаго ж гэта?

**Андрэй.** Ды спрачаліся, адкуль назва нашай вёскі Валеўка пайшла.

**Дзяўчынкі.** Ну і адкуль?

**Андрэй.** Дык вось мой дзед Ян вось што расказаў. Назва нашай вёскі Валеўка пайшла ад слова "вал" – паселішча за валам. Але ёсць і другое меркаванне. Калісьці рэчка, якая працякае па Валеўцы, была мнагаводная. Па ёй плавалі баржы, лодкі, на якіх купцы перавозілі свой тавар. А ў тым месцы, дзе знаходзіцца наша вёска, было плытка. І купцы волакам цягнулі свае грузы.

**Юрась.** А ці ведаеце вы, што наша Свята-Петрапаўлаўская царква – помнік гісторыі і культуры 18 стагоддзя? Праўда, пабудавана яна была ў 1685 годзе як Троіцкі касцёл дамініканцаў на сродкі брэсцкага ваяводы Стэфана Курчы. А ў 1833 годзе касцёл быў ператвораны ў праваслаўную царкву. Тут любіў бываць вядомы

беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч, які лічыў частку іканастаса царквы работай школы вядомага мастака Васняцова. Аб гэтым ён піша ў сваёй кнізе нарысаў “Зямля пад белымі крыламі”.

**Алеся.** Быў у Валеўцы яшчэ і касцёл. Ён пабудаваны ў пачатку 1930-х гадоў Карповічамі. У савецкія часы тут быў клуб, а ў 70-ыя гады будынак разабралі. Першая школа ў Валеўцы была адкрыта ў 1869 годзе. Гэта было трохкласнае народнае вучылішча, дзе займалася 34 хлопчыкі і адна дзяўчынка.

**Васілёк.** Толькі адна дзяўчынка!?

**Алеся.** Так-так. Першай настаўніцай была Окалава Юлія Юльянаўна. У 1955 годзе пачынае працаваць народны гісторыка-краязнаўчы музей, а ў 1961 годзе быў закладзены школьны парк-дэндрарый.

**Кацярынка.** Нашай школе ўжо 144 гады!!!

**Наталька.** Я жыву ў роднай вёсцы,
За лугамі і лясамі.
Тут заўсёды стрэнуць госця
Усім, што маюць дома самі.
А калі пачую спевы
Жаваронкаў і зязюляў,
То яшчэ больш разумею:
Валеўку люблю я.
Увесну вёска расцвітае
Вельмі казачна і гожа –
Быццам кветка, яна стане
Светлай, чыстай і прыгожай.

*Песня “Мой родны край”*

**Кацярынка**. А ў доме-музеі А. Міцкевіча я даведалася цікавыя факты пра нашу мясцовасць. Паслухайце! Апошнім уладальнікам маёнтка Чамброва, куды ўваходзіла вёска Валеўка, быў памешчык Карповіч. Мінавіта тут, у маёнтку Чамброва, жыла і выхоўвалася Барбара Маеўская, маці Адама Міцкевіча. На жаль, сядзіба згарэла падчас вайны і цяпер на тым месцы (а гэта ў раёне нашай былой мясцовай бальніцы) толькі рэшткі сцен стайні ды іншых гаспадарчых пабудоў. І ад старога парку засталося няшмат: некалькі струхлелых ліпаў, якія памятаюць паэта, ды дзве серабрыстыя таполі. Захаваўся таксама фамільны могільнік, дзе знаходзіцца капліца Карповічаў.

**Наталька.** Хоць хваліцца і нельга, але мне дазвольце, калі ласка! А хто з вас хоць раз наведаў нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы? А вось я была там і глядзела пастаноўку п’ есы Я.Купалы “Паўлінка”. Гэта цуд! Гэта шэдэўр! А на памяць у мяне ёсць фотаздымак з любімымі артыстамі. Вось як!

**Алёна.** Ну, Наталька, табе і пашанцавала!

**Насцечка.** А хто не любіць нашу Свіцязь? (Усе любім!) А як я люблю нашу Свіцязь! Гэта бясцэнны падарунак прыроды. Невялікае возера плошчай усяго толькі 2,2 км$^2$ з сярэдняй глыбінёй каля 3,5 м. Возера, як магніт, стагоддзямі прыцягвае да сябе. Роўная водная гладзь, празрыстасць і пяшчотны дотык супакойваюць, здымаюць напружанне, раствараюць у Сусвеце. Уладзімір Караткевіч у кнізе нарысаў “Зямля пад белымі крыламі” піша: “Возера Свіцязь, апетае Міцкевічам, вялікі, амаль правільны круг, з усіх бакоў зарослы дужа старымі дубамі. Вада тут такая, што, калі нават проста выкупацца – валасы рыпяць дні два”.

**Васілёк**. Цікава ведаць, што раслінны свет Свіцязі – амаль цалкам Чырвоная кніга. І ўсё мае свае імёны. Танюткія пруты, што на паўметра ўзвышаюцца з вады, – дагістарычная расліна лабелія Дортмана, а выкінутыя з вады маленькія зялёныя пярынкі, якія нагадваюць маладую цыбулю, – прыбярэжніца аднакветкавая. А на глыбіні паўтара метры расце палушнік азёрны, у якога замест каранёў – моцны клубень. На беразе месцамі зіхаціць яркім малінавым званочкам дзікі гладыёлус – шпажнік чарэпчаты. Названыя чырванакніжныя расліны сёння існуюць толькі на Свіцязі.

**Алёна.** А які прыбярэжны лес  чароўны і таямнічы!  Калі ты пачнеш разумець яго, ён можа паказаць зусім іншы Сусвет, які створаны прыродай. І тады ты яшчэ раз упэўніваешся, што гэта жывы арганізм, які тысячамі вачэй насцярожана сочыць за табой. Калі вузкай сцежкай я вандрую вакол возера, то пастаянна пераступаю цераз фантастычныя перапляценні каранёў, якія выйшлі на паверхню і склалі ўзор. Калі ўважліва ўгледзішся, то заўважаеш фігуркі чалавечых цел у кары дрэў, нейкія твары, постаці дзівосных жывёл. Побач векавыя дубы, нібы вартавыя возера, – высокія, магутныя, мудрыя. Усё бачаць і чуюць, усё ведаюць і ганарліва пануюць над усім сваёй веліччу.

**Светка.** Свіцязянскі ландшафтны заказнік як музей, у якім нічога нельга кранаць, а толькі любавацца і быць пад уздзеяннем гэтай прыгажосці і таямнічасці ўсё жыццё. Беражыце наш свіцязянскі цуд!

**Кацярынка.** А можа, хто з вас ведае легенды ці паданні пра возера Свіцязь?

**Наталька.** Я ведаю. Паслухайце. (*Расказвае легенду*).

**Кацярынка.** І сапраўды, колькі цікавага і загадкавага мы сёння даведаліся і пра паходжанне нашай вёскі, і пра возера Свіцязь. Нешта мы засумавалі. Дзяўчаткі, хадзем тупнем ножкамі, а хлопчыкі нам падыграюць!

*(Танец “Полька беларуская”)*

**Алёна.** А давайце я вам адну загадку загадаю, якую мне сёння мой бацька загадаў. Хочаце ці не? *(Усе згаджаюцца)* Ну, дык уважліва слухайце: па саломе ідзе – не шастае, па вадзе ідзе – не плюхае. *(Сонца і цень)*

*Усе дзеці ўразнабой даюць розныя адказы: правільныя і памылкавыя.*

А паслухайце тады яшчэ адну: пакуль бацька нарадзіўся, сын па свеце нахадзіўся (*Агонь і дым)*

**Насцечка.** А вось мая загадка: вырас лес белы ўвесь: ні зайсці ў яго, ні ўехаць. *(Малюнкі марозу на вокнах)*  І яшчэ загадаю адну: білі мяне, білі, калацілі, ва ўсе чыны ўзводзілі, з каралём на трон пасадзілі. *(Лён)*

**Юрась.** А маіх загадак, напэўна, ніхто не адгадае. Праверым, наколькі вы тут разумныя і кемлівыя! *(Дастае з капелюша і зачытвае)*.

Загадка першая:

Круглы, як сонца, шыпіць пад ім донца.
Падрумяніцца бачок – скоціцца пад ручнічок. (*Блін*)

Загадка другая.

Кішэні не мае, а сонца хавае,
Страху не мае, а ад ветру ўцякае.
Вачэй не мае, а слёзы пралівае. *(Хмара)*

Ну, а трэцюю загадку вы, напэўна, не адгадаеце.

Хоць бяскры, а лятае,
Безгалосы – свішча,
Хоць бязрукі, а, бывае,

Грушы ў садзе абівае,
Нават часам вырывае
Дрэвы з карнявішчам,
А як зморыцца – упадзе,
І няма яго нідзе. *(Вецер)*

**Кацярынка.** Ой, Юрасік, досыць табе загадваць. Давайце лепш у што-небудзь пагуляем.

**Усе.** Давайце! Давайце! Толькі ў што?

**Кацярынка.** Ну, хоць бы ў князя-князевіча. Хто жадае быць князем? (*Дзеці наперабой хочуць быць князем*). Каб мы тут не пасварыліся, давайце лепш палічымся. Станавіцеся ў круг.

Кацілася торба
З высокага горба.
А ў той торбе
Хлеб, пшаніца.
З кім жадаеш
Ты дзяліцца?

*На фоне музыкі пачынаецца гульня. Выбіраецца князь. Ён сядае і чакае дзетак. Яны, адышоўшы ўбок, зговорваюцца ягады збіраць, чытаць ці пісаць і інш. Тады дзеці ідуць да князя і кажуць:*

**Дзеці.** Добры дзень, князь-князевіч!

**Князь.** Добры дзень, мілыя дзеткі! Дзе вы былі? Што рабілі?

**Дзеці.** У лесе!

*Дзеці з дапамогай рухаў паказваюць, што яны згаварыліся рабіць, а князь павінен адгадаць. Калі адгадае, дзеці ад яго ўцякаюць, а ён ловіць іх. Каго зловіць, той робіцца князем, а ранейшы князь ідзе да дзяцей. Гульня паўтараецца спачатку.*

**Кацярынка.** Ох, нешта сумна стала. Давайце ў што весялейшае пагуляем.

*Дзеці пачынаюць гуляць у Панаса.*

**Андрэй.** А каб мы не пабіліся з-за таго, хто будзе Панасам, то прапаную на вілачніку вырашыць.

Ідзе да печы, бярэ вілачнік. Усе дзеці па чарзе хапаюць за дрэўка адной рукой, а затым другой. Таму, хто возьме верх палкі, завязваюць вочы. Дзеці пасля слоў “Панас, Панас, лаві нас, а не мышэй!” разбягаюцца, а “сляпому” даводзіцца лавіць іх па ўсёй хаце. Першы, каго зловяць, замяняе “сляпога” і сам пачынае лавіць, а былы становіцца ў шэраг тых, хто хаваецца.

**Кацярынка.** Ой, годзе! А то ўсе ходнікі парасцягвалі. Прыйдзе бабуля, то ўжо дасць мне! (*Папраўляе ходнікі*) А вось і яна. (*У хату заходзіць бабуля Алена.)*

## З’ява IV

**Бабуля Алена.** Ну, як вы тут, мае дзеткі, не сумуеце? А нядаўна я на лузе бусла сустрэла. Значыць, ужо і яны прыляцелі. А ці ведаеце вы, чаму бусел жаб і вужоў збірае? (*Усе артысты жадаюць паслухаць*). Ну дык слухайце.

Калі Бог зрабіў жабаў, яшчаркаў і вужоў, то злажыў іх у мяшок і даў яго трымаць бацяну, сказаўшы, каб ён туды не глядзеў. Бацяна ўзяла цікавасць, і ён расхіліў мяшок, каб паглядзець, што там ёсць. Калі гэта ён расхіліў мяшок, так усе яшчаркі, жабы і павыскаквалі. Прыйшоў Бог і ўбачыў, што бацян павыпушчаў усіх з меху, узяў

дубца і зачаў бацяна гасіць па заду. Ад гэтага ў бацяна зад і чорны. І сказаў яму Гасподзь:

– Усё жыццё хадзіць табе па балоце і збіраць тых жаб, што павыпускаў. Вось як было.

*Усе дзеці загаманілі са здзіўленнем.*

**Васілёк.** А хочаце паслухаць анекдот, які мне сёння мой бацька расказаў? Ну дык слухайце! Школьны інспектар, едучы праз вёску, запытаў хлопчыка, дзе дарога ў школу. Той дарогу паказаў. На другі дзень інспектар у школе спытаў у яго, выклікаўшы да карты, якая дарога вядзе ў Варшаву. Хлопец доўга пазіраў на карту, нарэшце сказаў:

– Вы не ведаеце дарогі ў школу, а хочаце, каб я ведаў дарогу ў Варшаву. (*Усе дзеці смяюцца*)

**Андрэй.** (*пасля невялікай паўзы*). Я таксама некалькі анекдотаў раскажу.

– А што, Янук, ці спадабалася табе твая новая настаўніца? – пытае маці ў сына.

– Ды, яна, мамачка, нічога сабе, і не старая. Але, мусіць, мала вучылася, бо ўсё ў мяне пытаецца.

Аднойчы прыйшоў Стасік са школы раней тэрміну.

– Што, зноў правініўся? – пытаецца маці.

– Настаўніца сама вінавата. Яна сказала: “Паводзьце сябе як дома”. Я так і паводзіў сябе. І яна адправіла мяне дамоў.

**Юрась** (працягвае). Настаўнік пытае ў вучня, які правінаваціўся:

– Ты чаму прыйшоў у школу адзін? Я ж казаў табе без бацькоў не прыходзіць.

– Я не маленькі, – адказаў вучань, – і без бацькоў дарогу ведаю.

**Кацярынка.** Дзяўчаткі, можа, давайце паспяваем?

*Дзяўчаткі згаджаюцца. У выкананні дзяцей гучыць беларуская народная песня “Зайграй жа мне, дударочку”. За кулісамі чуваць галасы і тупанне. Першым заходзіць з рэменем у руках дзядзька Мікола, потым цётка Ганна з дубцом.*

**Дзядзька Мікола.** А, вось яны дзе! Мы з маці з ног збіліся, шукаючы гэтага бэйбаса, гэтага вісуса! А ён у цёткі Алены прападае. (*Хапае за вуха Андрэйку і цягне яго бліжэй да гледачоў, хоча сцебануць паскам, але той ухіляецца*).

**Цётка Ганна** (*бярэ за падол спаднічкі сваёй дачкі Насцечкі і таксама хоча пакараць дубцом.*) Я ж цябе, мая галубка, аб чым прасіла? Каб Мікіту паглядзела. А яна – вы бачыце?! – зноў да Кацярынкі збегла, як тая козачка ў агарод. Ну, і дам! Ну, і атрымаеш ты ў мяне!

**Бабуля Алена.** Ну, і чаго вы тут разышліся, раскрычаліся? Ці даўно самі такія былі? Лепш павучыце гэтую блазноту словам добрым, песням ці танцам нашым.

**Кацярынка.** І праўда, дзядзька Мікола і цётка Ганна! Можа, вы нам таксама што-небудзь праспявалі б? Я чула, што вы такія прыгожыя галасы маеце. У нашай ваколіцы вы – найлепшыя спевакі!

*Усе дзеці просяць. Пасля невялікага вагання бацькі згаджаюцца і спяваюць некалькі песень.*

**Алена.** Мы любім Свіцязь,
Любім вёску
І прыгажосць наўкола.
І любім дом наш, сэрцу мілы,
Які завецца – школа!

*Усе ўдзельнікі выконваюць песню-пажаданне.*